# Абагульненне па раздзеле «Рэспубліка Беларусь і свет у канцы XX — першай чвэрці XXI ст.»

## Працуем з паняццямі

**1.** Падзяліце прапанаваныя паняцці на групы. Крытэрыі падзелу вызначце самастойна.

*Белавежскія пагадненні, БРЫКС, глабалізацыя, грамадзянская супольнасць, дзяржаўны суверэнітэт, інстытут прэзідэнцтва, інфармацыйная рэвалюцыя, «каляровыя рэвалюцыі», канстытуцыя, лічбавізацыя, неакаланіялізм, парламенцкая рэспубліка, постіндустрыяльная дзяржава, прававая дзяржава, прэзідэнцкая рэспубліка, рэферэндум, Садружнасць Незалежных Дзяржаў, сацыяльна арыентаваная эканоміка, сацыяльная дзяржава, Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі, унітарная дзяржава, Усебеларускі народны сход, Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва, шматпалярны свет.*

**2.** Вызначце паняцці, якія адносяцца да гісторыі Беларусі. Канкрэтызуйце іх прыкладамі раней вывучаных гістарычных фактаў (падзей, з'яў, працэсаў).

## Чытаем і пераўтвараем розныя віды тэкстаў

**3.** З абраннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 1994 г. пачаўся этап развіцця сапраўднага суверэнітэту беларускай дзяржавы, заснаванага на строгай вертыкалі ўлады з дакладна размежаванымі паўнамоцтвамі і шырокім, прамым волевыяўленнем народа.

Прачытайце прапанаваныя тэксты і выканайце заданні.

**А.** Сёння на сусветным харчовым рынку складваецца няпростая сітуацыя, справакаваная экспартнымі абмежаваннямі і геапалітычнай нестабільнасцю. Гэта сур'ёзна ўскладняе вырашэнне праблем харчовай бяспекі як у глабальным маштабе, так і ў асобных краінах. Час у чарговы раз пацвярджае слушнасць абранай Рэспублікай Беларусь стратэгіі забеспячэння харчовай бяспекі на аснове ўстойлівай уласнай аграпрамысловай вытворчасці

і разумнай сацыяльна-эканамічнай палітыкі, накіраванай на дасягненне высокай якасці харчавання насельніцтва.

«У краіне цалкам вырашаны праблемы харчовай бяспекі. Узровень самазабяспечанасці Беларусі малаком і малочнымі прадуктамі складае звыш 260 %. Гэта магчымасць накарміць дзве з паловай Беларусі. Амаль паўтары Беларусі можам забяспечыць мясам і мясапрадуктамі. Мы ўваходзім у пяцёрку лідараў сярод краін СНД паводле сярэднедушавой вытворчасці збожжа і агародніны. Больш за тое, мы гатовыя рабіць свой важкі ўнёсак у забеспячэнне харчовай бяспекі ва ўсім свеце». *(А. Р. Лукашэнка, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, 24 красавіка 2024 г.)*

**Б.** БелАЭС вывела на новы ўзровень эканоміку Беларусі і ўмацавала незалежнасць краіны.

«Мы значна прасунуліся ў пытаннях забеспячэння энергетычнай незалежнасці. Беларуская АЭС — гэта наш моцны брэнд і наш суверэнітэт. І гэта якасць нашага жыцця, якая забяспечваецца развіццём электражылля, электратранспарту, скарачэннем выкідаў парніковых газаў на 7 млн тон. Лічба ўражвае». (А. Р. Лукашэнка, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, 24 красавіка 2024 г.)

**В.** «Я, як Кіраўнік дзяржавы, ужо неаднаразова казаў: школа — гэта храм. У гэтым, калі хочаце, увесь сакральны сэнс. Тут павінен быць жалезны парадак і дысцыпліна як у арганізацыі адукацыйнага працэсу, так і ў матэрыяльным плане... Школа закладвае падмурак не проста будучыні. Чалавека!..». *(А. Р. Лукашэнка, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, 2023 г.)*

**Г.** У Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, зацверджанай VII Усебеларускім народным сходам, упершыню з’явіўся тэрмін «электаральны суверэнітэт». Гэта неад’емнае і выключнае права нашай дзяржавы самастойна і незалежна арганізоўваць і праводзіць выбары, рэферэндумы ў мэтах забеспячэння рэалізацыі паўнаўладдзя народа і свабоды яго выбару пры вяршэнстве Канстытуцыі і нацыянальнага заканадаўства, недапушчэння ўмяшання ў выбарчы працэс.

«У гэтай сувязі мы выбудавалі для сябе чатыры асноўныя кірункі, якія дазваляюць нам забяспечваць электаральны суверэнітэт. Першы кірунак — стварыць эфектыўную заслону знешняму ўмяшан-

ню ў электаральныя працэсы: інфармацыйную, фінансавую, юрыдычную, арганізацыйна-тэхнічную. Другі кірунак — не дапусціць выкарыстання службовых паўнамоцтваў абранай асобы насуперак нацыянальным, дзяржаўным інтарэсам. Трэці кірунак — забеспячэнне бяспекі ўдзельнікаў электаральнага працэсу. Чацвёрты кірунак — работа з міжнароднымі арганізацыямі, на міжнароднай арэне ў плане выпрацоўкі стандартаў ацэнкі выбараў». *(І. В. Карпенка, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь, 6 лістапада 2024 г.)*

Д. «Міністэрства адукацыі Беларусі ставіць перад сабой задачу, каб выпускнік кожнай установы адукацыі быў патрыётам нашай краіны. <…> Сёння проста выпусціць адукаванага чалавека недастаткова. Гэта павінен быць чалавек, які любіць сваю Радзіму і гатовы сваёй працай рабіць нашу краіну лепшай і прыгажэйшай. Кожны з нашых навучэнцаў павінен разумець, што незалежнасць краіны каштуе вельмі дорага. Кошт вылічваецца не толькі фінансавымі рэсурсамі, але і шэрагам іншых складнікаў. Мы павінны разумець, што, калі будзе неабходнасць, кожны з нас мае быць гатовы абараняць сваю Радзіму, у тым ліку і са зброяй у руках». *(А. І. Іванец, Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь, 24 сакавіка 2022 г.)*

Е. У Беларусі зацверджана Канцэпцыя забеспячэння суверэнітэту Рэспублікі Беларусь у сферы лічбавага развіцця да 2030 г. Канцэпцыя вызначае лічбавы суверэнітэт як неад’емнае права дзяржавы кіраваць дзяржаўнай інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктурай і інфармацыйнымі рэсурсамі, ажыццяўляць над імі кантроль; абараняць свае інтарэсы, праводзіць незалежную знешнюю і ўнутраную дзяржаўную палітыку ў сферы лічбавага развіцця.

Для дасягнення лічбавага суверэнітэту плануецца развіваць нацыянальную IT-індустрыю ў частцы распрацоўкі айчыннага праграмнага забеспячэння; прамысловы патэнцыял для распрацоўкі і вытворчасці высокатэхналагічнай прадукцыі (мікра- і радыёэлектроніка, апаратныя і праграмна-апаратныя рашэнні); фарміраваць інфармацыйна-камунікацыйную інфраструктуру, якая забяспечыць неабходныя ўмовы для стварэння і выкарыстання лічбавых тэхналогій пры неспрыяльных знешніх уздзеяннях. *(Паводле матэрыялаў https://etalonline.by, 24 студзеня 2025 г.)*

На аснове прапанаваных тэкстаў складзіце схему «Складнікі дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і фактары, якія іх забяспечваюць».

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія новыя заканадаўчыя нормы дапамагаюць абараніць электаральны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь.

Ці згодныя вы з меркаваннем, што патрыятызм беларусаў — найважнейшы фактар забеспячэння дзяржаўнага суверэнітэту? Сваю думку растлумачце.

## Аналізуем, тлумачым, разважаем

**4.** Устанавіце ўзаемасувязь паміж гістарычнымі фактамі:

А) дэкаланізацыя — узмацненне краін «глабальнага Поўдня»;
Б) праявы нацыянальнага сепаратызму — распад СССР;
В) рэспубліканскі рэферэндум 1996 г. — ператварэнне Рэспублікі Беларусь у прэзідэнцкую рэспубліку;
Г) захаванне традыцыйных беларускіх каштоўнасцей — умацаванне нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

**5.** Дакажыце або абвергніце наступныя тэзісы:

А) «каляровыя рэвалюцыі» парушаюць нормы міжнароднага права і суверэнітэту дзяржаў;
Б) ад пачатку XXI ст. у свеце пачаўся пераход ад аднапалярнай мадэлі да шматпалярнай;
В) беларуская мадэль дэмакратыі пабудаваная на прамым удзеле беларускага народа ў прыняцці найважнейшых дзяржаўных рашэнняў;
Г) палітыка беларускай дзяржавы накіраваная на падтрымку і ўмацаванне міжнацыянальнага і міжканфесійнага міру і згоды ў беларускім грамадстве;
Д) дзяржаўная гістарычная палітыка — важны фактар забеспячэння нацыянальнай бяспекі;
Е) у сваёй знешняй палітыцы Рэспубліка Беларусь рэалізуе прынцып шматвектарнасці.

## Сістэматызуем веды

**6.** Выкарыстоўваючы стужку часу, прадстаўленую ў пачатку раздзела IV, выканайце наступныя заданні.

А. Паразважайце, якімі падзеямі / з'явамі / працэсамі вы б дапоўнілі стужку часу. Чаму?

Б. Прапануйце форму для іх абазначэння (карціна, картасхема, цытата, фотаздымак і інш.).

В. Прадстаўце развіццё Рэспублікі Беларусь у канцы XX — першай чвэрці XXI ст. у выглядзе лагічнай схемы (ментальнай карты). Адлюструйце ў ёй эканамічнае, палітычнае, сацыяльнае і духоўнае развіццё краіны.

**7.** Работа ў міні-групах. Складзіце топ-10 дасягненняў Рэспублікі Беларусь у канцы XX — першай чвэрці XXI ст. Што, на вашу думку, можна аднесці да ўжо сталых традыцый суверэннай Беларусі?